Вескі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: e-krama.com, pahonia.com
Электронны адрас: viestki@mail.com
P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 4(602)
Красавік 2016 г.

Гуканьне вясны на Гудзоне ў штаце Нью-Ёрк

Як добра, што Гуканьне вясны, ладжаае сябрамі Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" ў Нью-Ёрку, ужо зрабілася традыцыйным. Хоць сіноптыкі ў нядзелю 6-га сакавіка пагражалі парывістым ветрам і нават сьнегам, мы зноў сабраліся на маляўнічым беразе ракі Гудзон .

Сьвежы ветрык і сонейка, якое ня столькі грэла, колькі сьвяціла, надавалі нам імпэту. Беларусы, якія на радзіме ніколі ня бралі ўдзелу ў гэткіх сьвятах, раптам атрымалі магчымасьць дакрануцца да ўласнае культуры тут, у замежжы.

Строі, вяночкі на галоўках дзяўчат і саламяныя птушкі з вобразам зімы й холаду ў абліччы лялькі Марэны адразу стварылі адказны й урачысты настрой. Усе сталі ў кола вакол іх, пайшлі па руху сонца. І паляцелі загукальныя беларускія песьні па навакольлю: "Вясна, хадзі ў двору, нясі ключ за сабою, зіму замыкаці, вясну адмыкаці!", – якія суправаджаліся асаблівым, уласьцівым толькі для вясьнянак прыпевам, накшталт перагукваньня: "Гу-гу-гу!" Пры тым усе ўдзельнікі ўскідвалі рукі ўгару, пасылаючы гэты гук у касьмічную прастору. Таму ж і атрымала сьвята сваю назву – Гуканьне вясны.

Карагоды, "крывыя танкі" й гульні з пацалункамі разьвесялілі ўсіх.Пасьля кожны, хто хацеў, напісалі па цыдулках усё нядобрае, што здаралася зь імі ў мінулым годзе і, каб яно больш не паўтаралася, прымацавалі цыдулкі да строю лялькі Марэны і пад песьні ўкінулі яе ў раку.

Разыходзіцца не хацелася, але нас чакала рытуальная страва ў выглядзе гарохавага супу, грэчнявай кашы з гуляшом, грыбнога булёну, бліноў і пірагоў з макам і кампотам ці кавай. Падсілкаваўшыся, хлопцы пайшлі гуляць у футбол, а іншыя пачалі сьпяваць застольныя песьні. Цяпер мы пэўныя, што адыдуць халады зь вятрамі й сьнегам, ды заўладарыць вясна.

Валяціна ЯКІМОВІЧ





Сакавіцкі сход Згуртаваньня “Пагоня” і ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР

У суботу 19-га сакавіка ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы сакавіцкі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Гэтым разам сход быў спалучаны са сьвяткаваньнем надыходзячага беларускага нацыянальнага сьвята – Дня Волі і 98-й гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка прывітаў прысутных і павіншаваў з надыходзячым сьвятам. Затым ён кортка распавёў пра гісторыю беларускай дзяржаўнасьці, пра перадумовы прыняцьця Акту 25-га Сакавіка 1918 года. Прамоўца ў прыватнасьці адзначыў: “Непрыяцелі Беларусі ўвесь час, і па сёнешні дзень, гавораць пра штучнасьць створанай беларускай дзяржавы, пра адсутнасьць перадумоваў для дзяржаўнага існаваньня беларускага народу. Між тым насамрэч беларуская дзяржаўнасьць, яе раньнія формы, сягаюць у часы Полацкага княства і пасьля праз шэраг іншых княстваў на беларускіх землях кансалідуюцца ў Вялікае Княства Літоўскае. Традыцыі Вялікага Княства ў трансфармаваным выглядзе захоўваліся стагодзьдзямі ў памяці народу. Таму калі аспрэчваецца гісторыя народу беларускага ды навязваюцца гістарычныя канцэпцыі суседніх народаў, гэта ёсьць банальная дыскрымінацыя, але таксама сумесь невуцтва, антыгістарычных паглядаў і прасоўваньня інтарэсаў і ўплыву замежных дзяржаваў, асабліва той – з усходу. Праклямуючы, усьлед за нашчадкамі Мураўёва-вешальніка, што беларускі нацыянальны рух гэта “польская інтрыга”, а Беларуская Народная Рэспубліка – “кайзераўскае ўтварэньне”, ворагі беларушчыны цяпер, як і 98 год таму, адмаўляюць беларускаму народу ў праве на існаваньне ў сваёй нацыянальнай дзяржаве. А гэткія дзеяньні ёсьць ганебным анахранізмам, якому суджана раней ці пазьней адыйсьці ў нябыт. Менавіта абвешчаньне незалежнасьці Беларусі 25-га сакавіка 1918 года і стварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі сталі перадумовамі ставарэньня БССР, а пазьней – Рэспублікі Беларусь. І менавіта гэты неабвержны факт дасюль замоўчваецца і абмінаецца прамаскоўскім рэжымам Лукашэнкі. Нават цяпер, калі ўзьнікла пагроза для незалежнасьці Рэспублікі Беларусь, і анэксія па крымскім сцэнары зрабіліся вельмі рэальнаю мажлівасьцю, Лукашэнка і ягоныя памагатыя ня ў стане пераадолець сваю паталягічную нянавісьць і боязь беларускіх нацыянальных сілаў, беларускай нацыянальнай ідэі. Але ідэя гэтая, увасобленая ў ідэалах Акту 25-га Сакавіка, жыве і натхняе новыя пакаленьні беларускіх людзей”.

Затым слова ўзяў сп. Зьміцер Шчыгельскі, кіраўнік арганізацыі “Беларусы ў экзылі”, які нядаўна вярнуўся з Украіны. Ён прывітаў прысутных і перадаў прывітаньне ад імя прадстаўнікоў тактычнай групы “Беларусь”, што ваююць за тэрытарыяльную цэласьць Украіны, а таксама і Беларусі. У сувязі з надыходзячым сьвятам Дня Волі прамоўца сказаў наступнае: “Гісторыя – гэта працэс, які ніколі не спыняецца. У народа была і ёсьць мара пра сваю нацыянальную незалежную дзяржаву. І вельмі добра, што гэтая дзяржава цяпер, дзякуючы намаганьням пакаленьняў беларускіх нацыянальных дзеячоў, рэальна існуе. Нажаль, існуе ня ў тым выглядзе і ня з тым зьместам, за які змагаліся нашыя папярэднікі, але ёсьць галоўнае – дзяржаўнасьць, якую неаб-

заканчэньне на бачыне 3



Сакавіцкі сход

заканчэньне з бачыны 2

ходна паставіць на сапраўды нацыянальныя рэйкі, і гэта будзе зроблена раней ці пазьней. Цяпер усе беларусы, што ваюю́ць ва Ўкраіне, ваююць і за Беларусь, бо Беларусі пагражае той самы вораг. Гістарычна Беларусь і Ўкраіна былі разам у 1918-м годзе, і яны мусяць быць разам і сёньня, каб супрацьстаяць агрэсіі з усходу. Людзі мусяць вырашыць, кім яны хочуць стаць – аб'ектам ці суб'ектам гісторыі".

З чытаньнем сваіх вершаў выступіла паэтка Ірына Хадарэнка. Яна перш распавяла пра сябе і сваю творчасьць. У прыватнасьці, яна адзначыла, што яе найперш прыцягвае грамадзянская і нацыянальная тэматыка. Таму адзін зь вядомых літаратурных крытыкаў Леанід Галубовіч, можа і рэзка, адзначыў, што ў яе вершах "больш палітыкі, чым паэзіі". Тым ня менш, паэтка адзначыла, што піша пра тое, што яе хвалюе. А тое, што палітыка справа брудна, і людзі мастацтва ня мусяць ёю займацца, ёсьць мітам, якім суцяшаюць сябе маладушныя і крывадушныя асобы. Затым Ірына Хадарэнка прачытала некаторыя творы са свайго зборніку "Сьвядомаграфія". Яе вершы былі вельмі цёпла прынятыя прысутнымі.



Ірына Хадарэнка

Перад сваім канцэртам паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш распавёў пра сябе і сваіх продкаў, пра пачаткі сваёй грамадзкай і творчай дзейнасьці. Ён распавёў пра сваю адносна новую нізку вершаў "Граблі" і прасьпяваў песьні на вершы зь яе. Затым прагучэлі песьні на вершы зь нізкі "Песьні касінераў", шмат зь якіх гучаць актуальна і ў нашыя часы. Сп. Сокалаў-Воюш выканаў таксама песьню, што раней упершыню прагучэла менавіта ў гэтай залі Дома Маракоў – "Маладзенькі случчак паміpae". Выканаўца распавёў пра гісторыю напісаньня некаторых сваіх песьняў, як, напрыклад, "Прыстанкі", "Мяналёг здрадніка Парфіяновіча", "Ніколі ня будзе над намі Расея". Сп. Сокалаў-Воюш распавёў пра свайго цесьця сьв. пам. Францішка Бартуля, колішняга актыўнага дзеяча беларускай грамады ў Амэрыцы. Жыцьцёвы лёс Ф. Бартуля даў выканаўцу шмат натхненьня для творчасьці, а удзел Бартуля ў нацыянальным жыцьці ў часы Другой сусьветнай вайны, як і дзейнасьць іншых нацыянальных дзеячоў у той час, яшчэ чакаюць цьвярозага і аб'ектыўнага досьледу. Сп. Сокалаў-Воюш прасьпяваў таксама песьню "На барыкадзе", прысьвечаную надзённаму пытаньню маральнага выбару адносна непасрэднага ўдзелу ў змаганьні. Выступ сьпевака быў горача сустрэты слухачамі.



Сяржук Сокалаў-Воюш

Затым адбыўся фуршэт зь віном і пачастункамі, за якім выступоўцы, сябры "Пагоні" і госьці мелі нагоду калегавацца ў неафіцыйнай атмасфэры.

Падзяка за ўдэкараваньне залі належыцца сп-ні Ганьне Шарко, за арганізацыю сьвяточнага стала і пачастункаў спням Лене Рыжай і Ганьне Бартуль. Спва Мілеўскіх фундавала на сьвяточны стол "Зуброўку" і віно.

Віталь ЗАЙКА

Імпэрыя зла

заканчэньне з бачыны 4

дарэчы, з чорнымі сьвятамі, гэта цывілізацыя R.I.P. Сьвяткаваньне сьмерці, але ня проста сьмерці, а сьмерці выбраных, трэба чытаць і успрымаць, выбітных асобаў. Паназірайце за стужкаю ў дні, калі паміpae нейкі вядомы чалавек, поп-зорка ці нейкі штучна створаны ідэалягічным цэнтрам набліст-аўтарытэт. Запісы ў гэтыя дні можна ахарактарызаваць як масавы нэкрапсыхоз. Людзі, якія ніколі ў жыцьці не прачыталі ніводнага нават радка з кніжкі Ўмбэрта Эка, пачынаюць вымайстроўваць дэфірамбы адданасьці і захапленьня. І вельмі рэдка заўважаецца, што той ці іншы чалавек выдае пост, маўляў, хопіць, ведаю ўжо, што пісьменьнік памёр. Нядаўна, калі ўся стужка зьверху данізу заіскрылася інфармацыяй пра тое, што памёр Дэйвід Боўі, я, па-шчырасьці, упершыню даведаўся пра існаваньне такой асобы. У такія моманты робіцца прыемна, што ты не ахвяра маскультуры, прынамсі не ў такой ступені, як дэмакратычная большасьць.

Трэцяя калёна – гэта салідарнасьць, усялякай масьці пэтыцыі, заклікі, сацыяльныя акцыі, карацей, Оруэлаўскія пяцімінуткі нянавісьці. На паверхнасным узроўні ўсе гэтыя акцыі пранікнутыя любоўю, але на ўзроўні глыбінным, гэта і ёсьць выплескі нянавісьці, прасякнутыя сучаснай рэлігіяй – паліткарэктнасьцю. Таму не сьпяшайцеся наступным разам падпісваць пэтыцыю за вызваленьне коней ад цяжкой працы ў хамуце, паколькі пасьля вызваленьня ад цяжкой працы, гэтыя коні адправяцца адразу на бойню, а фурман стане беспрацоўным і, магчыма, сап'еццa. І наогул, у такіх эмансіпацыйных акцыяў звычайна сотні ахвяраў і тысячы адмоўных наступстваў.

Усе карыстальнікі сацыяльных сетак – гэта грамадзяне новых імпэрый. Ты можаш быць грамадзянінам крытычным і незадаволеным, але ты і так будзеш жыць зь сінім пашпартам фэйсбука. Беларусы, як заўсёды, нават у гэтай дзяржаве застаюцца ўзорнымі грамадзянамі. Гэта можна заўважыць па тым, зь якой любоўю яны пішуць свае беларускія прозьвішчы на ангельскасаксонскі капыл. Яны першымі пацягнуцца сьвяткаваць дзень роднай мовы, але сваё імя беларускай лацінкай не напішуць ні за што ў сьвеце, бо грамадзянства фэйсбука дыктуе ім абсалютова іншы ўзор паводзінаў.

Віталь ВОРАНАЎ

“Галгатня пра ЗыШыА”

Імпэрыя зла

Тэрыторыя краіны ці яе карысныя выкапні сёньня ўжо ня маюць асноўнага стратэгічнага значэньня. Сёньня галоўнае – гэта колькасьць карыстальнікаў той ці іншай падкантрольнай сацыяльнай сеткі, бо маса карыстальнікаў – гэта патэнцыйныя спажыўцы маскультуры, а празь яе і любой іншай маспрадукцыі. Таму калі сусьветны ўрад існуе, а ў гэтым сумнявацца ня варта, то ягоная сядзіба не ў Парыжы, Лёндане ці Вашынгтоне, а ў вашых сацыяльных сетках, прычым, хучэй за ўсё, ва ўсіх без выключэньня.

Рэй тут, канешне, вядзе фэйсбук са сваімі, на сёньня, паўтара мільярдамі актыўных карыстальнікаў! Гэта ня проста дзяржава, гэта супердзяржава. І, як у кожнай дзяржаве, у ёй свае правілы, свая мода і свае норавы. Інфантыльныя коцікі і сабачкі – гэта толькі вяршыня айсбэргу. Дзяржаўная ідэалёгія гэтай супердзяржавы трымаецца на трох калёнах: сьвяты-нэкралёгі-салідарнасьць. Характар сьвятаў, якія адзначае фэйсбук, дакладней перадае расейскае слова “праздник” (праздный), паколькі яны без духоўнага напаўненьня, у адрозьненьні ад традыцыйных сьвятаў нашага народнага календара. Тут можна вылучыць дзень Св. Валянціна, Хэлаўін і ўсе афіцыйна замацаваныя нейкай-там-на-версе-безумоўна-вельмі-аўтарытэтнай-арганізацыяй дні прысьвячэньні (дзень змаганьня са СНІДам і іншыя міжнародныя дні памяці).

Усе гэтыя “празьнікі” незалежна ад іх гістарычнага паходжаньня можна было б умоўна назваць чорнымі сьвятамі, што асабліва добра відаць у сымболіцы Хэлаўіна. Спэцыфіка гэтых псэўдасьвятаў у тым, што зьвязаныя



яны з дрэннай, адмоўнай энэргетыкай і вельмі часта іх можна наўпрост супрацьставіць нашым традыцыйным белым сьвятам. Хэлаўін, як прыклад простага запярэчаньня традыцыі Дзядоў, Сьв. Валянцін – як антыпод Купальля, а Міжнародны дзень роднай мовы – як прыклад культурніцкага замбаваньня. Нашым продкам не прыйшло б у галаву сьвяткаваць дзень роднай мовы, паколькі родная мова была наўпрост зьнітаваная са штодзённым побытам і ўяўленьнем пра навакольны сьвет, і ўсё гэта на працягу 365 дзён году. Міжнародны дзень роднай мовы, устаноўлены ідэалягічным цэнтрам на 21 лютага, намякае (імклікуе), што ёсьць нейкая адзіная, асноўная мова для ўсіх абыватэляў новага парадку, а ў сувязі з гэтым, пакуль яшчэ, адведзены адзін дзень на шанаваньне матчынай мовы. Такая першая фаза перад канчатковай уніфікацыяй.

Вельмі характэрна таксама назіраць агульнае паніжэньне настрою і ўсюдыпрысутную дэпрэсію ў так званы дзень закаханых, дзень, які па сутнасьці павінен быў бы несьці процілеглую, станоўчую энэргетыку. Людзі сядзяць у фэйсбуку і дэпрэсуюць, што або незакаханыя, або закаханыя нешчасьліва. Але біямаса, вядома, гэтых нюансаў па інэрцыі не ўлаўлівае і працягвае натхнёна сьвяткаваць. Пэўнай складовай часткай гэтай калёны зьяляюцца таксама пустыя, найчасьцей фармальна-рытуальныя віншаваньні з днём нараджэньня. Справа ў тым, што калі б усе гэтыя „празьнікі” былі карыснымі і добрымі, яны б дакладна знайшлі сваё адлюстраваньне ў сьвяточным календары нашых продкаў.

Другая калёна дзяржаўнай ідэалёгіі імпэрыі фэйсбука, што зьнітаваная,

заканчэньне на бачыне 3

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

К. Канцавая 60
М. Клакоцкі 60
Н. Кузьмічук 60
М. Марчук 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня” *Viktar Yedzinovich.*

Шаноўныя сябры, калі ласка, своечасова аплочвайце сяброўскія складкі і падпіску на “Весткі й Паведамленьні”.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **9-га красавіка 2016 года** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**. Будынак знаходзіцца на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля сходаў на 2-м паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

В. Балашчэнка 30
М. Марчук 30
Д. Турсумбаеў 25
К. Верабей 20

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь можна даслаўшы аплату гадавой падпіскі ($30) на адрас: **Marat Klakotski***
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні” **Viktar Yedzinovich**.*

*Паважаны **Аляксандар Дубіцкі**, калі ласка, паведаміце рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*